***Вішнеўская Ірына Ўладзіміраўна,***

***дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права БДЭУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт***

# АБАРОНА АСАБІСТЫХ НЕМАЁМАСНЫХ ПРАВОЎ ПА ЗАКАНАДАЎСТВУ СЯРЭДНЕВЯКОВАЙ БЕЛАРУСІ

На сённяшні дзень асабістыя немаёмасныя правы замацаваны як міжнароднымі нарматыўнымі прававымі актамі (Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, міжнародныя пакты аб грамадзянскіх і палітычных правах, Парыжская хартыя для новай Еўропы і інш.), так і нацыянальным заканадаўствам многіх краін, у тым ліку і Рэспублікі Беларусь. Нарматыўнае ўрэгуляванне дадзеных правоў прадугледжвае іх надзейную абарону. Асаблівасцю абароны асабістых немаёмасных правоў з'яўляецца спалучэнне мераў прыватна-прававога і публічна-прававога характара. Так, за прычыненне шкоды асобе прадугледжваюцца меры крымінальнага або адміністратыўна-прававога характара, разам з тым, пацярпелы можа патрабаваць прымянення грамадзянска-прававых мер абароны, напрыклад, спагнання маральнай шкоды.

Нормы аб абароне асабістых немаёмасных правоў грамадзян (падданых) можна знайсці яшчэ ў рымскам праве, калі за пасягненне на некаторыя іх асабістыя даброты прадугледжвалася матэрыяльная кампенсацыя маральнай шкоды, напрыклад, у выніку ўзбуджэння іску аб крыўдзе [1, с.337]. Аналіз заканадаўства сярэдневяковай Беларусі дае магчымасць таксама вылучыць у ім аналагі інстытута абароны асабістых немаёмасных правоў. Так, у прывілейны перыяд развіцця права Вялікага Княства Літоўскага былі замацаваны такія асабістыя немаёмасныя правы, як права на асабістую недатыкальнасць (Прывілей 1434 г.), права на карыстанне гербамі (Прывілей 1413 г.). Спачатку гэтыя правы

распаўсюджваліся толькі на шляхту, каталіцкага, а з 1434 года – і праваслаўнага, веравызнання. Некаторыя правы, напрыклад, на выезд за межы дзяржавы, якія першапачаткова мелі сілу толькі для "княжат, рыцараў, шляхты і баяр", (Прывілей 1447 г.), згодна з нормамі III Статута 1566 г. распаўсюджваліся на асоб "всякага стану", пад якімі меліся на ўвазе, хутчэй за ўсё, гарадскія жыхары – "месцічы". Цікава, што акрамя мэты выезду, адзначанай у Прывілеі 1447 г. "...для лепшого шчастья набытия, а любо учинков рытерских..." [2, с. 44], у Статуце 1566 г. называецца яшчэ навука і лячэнне [3, с. 83].

Правобразам абароны дзелавой рэпутацыі службоўцаў можа разглядацца норма, замацаваная ў ар. 17 Прывілея 1492, у якой прадпісваецца не пазбаўляць пасады чыноўніка па першаму абвінавачванню, а паставіць перад вялікім князем "... другі бок і пасля заслухоўвання справы, вінаваты павінен быць пакараны па заслугах. Без віны мы не маем права пазбаўляць яго пасады" [2. с. 50].

У Статутах 1529, 1566, 1588 гг. абарона асабістых немаёмасных правоў набыла далейшае развіццё і замацаванне. У прыватнасці, нормы Статутаў гарантавалі абарону ад замаху на жыццё, здароўе, гонар і годнасць асобы, захаванне асабістых і сямейных тайнаў. Статуты гарантуюць таксама права на жыллё, замацоўваюць меры адказнасці за наезды на шляхецкія маёнткі. У кантэксце адзначанага ўзгадаем, што ў сучаснай юрыдычнай навуцы гэта права разглядаецца не толькі як маёмаснае, але і як комплекснае права, якое забяспечвае асобе аўтаномнасць у грамадстве і разам з тым дае магчымасць самаразвіцця, садзейнічае стварэнню сям'і і іншых умоў годнага жыцця чалавека.

Выклікае цікавасць і такая акалічнасць, што некаторыя вядомыя ў сучасным праве асабістыя немаёмасныя правы ўзгадваюцца ў Статутах, але не ў сэнсе іх абароны, а наадварот, у сэнсе абмежавання, і нават

забароны. Напрыклад, права выбару заняткаў, прафесіі было абмежавана для шляхты забаронай займацца гандлем або рамёствамі. У арт. 25, р. 3 Статута 1588 г. гаворыцца, што калі шляхціч "... ушол бы до места и мешкал там торг местский, ведучи або и шинк в доме маючы и локтем меречи або ремесла робечи на верстате, таковым вжо з вольнастей шляхетских веселитисе не маеть" [4., с. 368]. Для простанароддзя ўводзілася забарона на заняцце ім дзяржаўных пасад, абранне (або прызначэнне) суддзямі, на адвакацкую дзейнасць: "...врядов наших простага народу людем давати не маем..." [4, с.121]. Заканадаўства таксама абмяжоўвала асабістае права чалавека на яго знешняе індывідуальнае аблічча. Так, Статут 1566 (арт. 4, р. 12) уводзіў норму, якая тычылася спецыяльнага адзення для яўрэяў: "...уберъ ихъ быти значный: шапки або биретъ жолтый, так тежъ и завиванья белыхъ головъ полотно жолтое, або таму падобнае, иже бы знак и певное  рознанье была хрыстіянина отъ жида" [3, с. 193]. Статут 1588 адмяніў норму аб адзенні, але пакінуў абмежаванне ў колькасці ювілірных упрыгожванняў, якія маглі насіць яўрэі (арт. 87, р. 12). Адзначым, што пытанне аб заканадаўчых абмежаваннях на раскошу  не толькі для яурэяў, але і для хрысціянскай  шляхты, дыскутавалася ў палітыка-прававой думцы XVI стагоддзя. Напрыклад, Андрэй Волан, быў упэўнены, што "калі раскошу не трымаць у цуглях законаў, жанчыны не толькі прамантачаць маёмасць сваіх бацькоў, дзядоў і продкаў, а давядуць да пагібелі ўвогуле ўсё грамадства”, таму  правазнаўца і палітык прапаноўваў "...стварыць законы, якія перакрыюць усе крыніцы сілкавання злашчаснай раскошы і ўрэшце ліквідуюць яе"[ 5, с. 86]. Як бачым, калі правы асобы ўступалі ў супярэчнасць з інтарэсамі феадальнага грамадства, тады ў прававой думцы замацоўвалася ідэя ў неабходнасці абмежаванняў асабістых правоў і дабротаў на карысць дзяржавы, як асобай арганізацыі палітычнай улады. Значная колькасць прававых актаў беларускага сярэднявечча і ранняга но-

вага часу была прысвечана абароне жыцця, здароўя, гонару і годнасці асобы. Апошняе тычылася ў першую чаргу шляхты. За забойства чалавека або нанясенне яму цяжкіх цялесных пашкоджанняў законам прадугледжваліся як меры крымінальнай адказнасці, (смяротнае пакаранне, турэмнае зняволенне, пакаранне па прынцыпу таліона) так і выплата "галаўшчызны", а таксама штраф за забойства, або навязка (штраф за цялесныя пашкоджанні) [4, с. 291]. Апошнія можна разглядаць як аналаг кампенсацыі маральнай шкоды родзічам забітага або пацярпеламу. Памер кампенсацыі залежыў ад саслоўнага паходжання пацярпелага.

Звернемся да аналізу нормаў Статутаў ВКЛ, якія рэгламентавалі абарону немаёмасных правоў асобы. Статут 1529 г. прадугледжваў выплату галаўшчызны за забойства шляхціча ў памеры 100 коп. грошай родзічам і 100 коп. грошай у скарб дзяржавы (арт. 28, р. VII). Артыкулы 1-4, раздзела XI " О головщины людей путных и мужицкие и паробоцкие" замацоўваюць наступныя памеры галаўшчызны: за чалавека путнага – 20 рублёў грошай, за бортніка – 8 рублёў грошай, за ювіліра, арганіста, аружэйніка, пекара, повара, цясляра, каваля, сапожніка і іншых рамеснікаў – 12 рублёў грошай, за цяглага селяніна – 10 рублёў грошай, за чэлядзіна – 5 коп. грошай [6, с. 114-115]. Як бачым, жыццё чалавека не мела аднолькавага кошту, а залежыла ад яго саслоўнай прыналежнасці, ад ступені асабістай залежнасці і нават ад прафесійнай дзейнасці. Першы Статут рэгламентуе адказнасць за нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, якія прынеслі шкоду фізічнаму здароўю асобы, сталі прычынай яе пакут. Прадугледжвалася выплата "навязкі" і вызначаўся яе памер, які таксама дыферэнцыраваўся ў залежнасці ад сацыяльнага стану чалавека. Так, згодна з арт. 1, р. XI Статута 1529 г. за забіццё чалавека путнага прызначалася навязка 3 рублі грошай, а бортника – 1 рубель, а іх жонам – у двайным памеры. У адпаведнасці з арт. 2 гэтага раздзела найбольш запатрабаваным

у грамадстве і дзяржаве прафесіяналам-рамеснікам (ювілірам, арганістам, пушкарам, пекарам і інш.) навязка складала – 1 рубель. Статут абараняе пасадавую рэпутацыю асобы і прызначае за забіццё службоўцы – цівуна, ключніка, прыстава пры выкананні імі абавязкаў – навязку 3 рублі грошай. Такім чынам, гэта норма ахоўвала як асабістае немаёмаснае права, так і інтарэсы дзяржавы, на карысць якой асоба выконвала свае абавязкі. Статут вызначае адказнасць і за нанясенне цялесных пашкоджанняў цягламу селяніну, або чэлядзіну. Першаму кошт навязкі складаў паўрубля грошай, а другому- паўкапы грошай. Жанчыне таго ж сацыяльнага стану – удвая больш (арт.5, р. XI ).

Статут захоўваў шэраг нормаў, якія дазвалялі пацярпеламу шукаць праз суд грашовую кампенсацыю за замах на яго гонар і годнасць. Так, у арт. 20 замацоўвалася норма, якая вызначала працэдуру разгляду ў судзе спраў аб абражанні гонару на працягу года: "А калі бы на той час пригодилося нам великими трудностями недоспех таковых справ через год чотырі роки уставляем; и коли бы на первый и второй або на третий рок в таковых то справах конец не был  вчинен, ино коли остаточный рок прийдеть, конечную справедливость без отволоки...вчиним..." [6, с. 39]. У арт. 12, р. III прадугледжвалася адказнасць у выпадку калі адна асоба назаве другую незаконнанароджанай, але не зможа даказаць абвінавачанне. Паклённік павінен быў адвесці перад судом агавор такімі словамі: "што есми менил на тебе, ижебы ты злого ложа сын, менил есми то на тебе, яко пес" [6, с.52]. Статутам асаблівая ўвага  надавалася абароне годнасці шляхціча. Па факту безпадстаўнага непрызнання шляхецтва пакрыўджаны мог звярнуцца ў суд, які патрабаваў доказаў ад крыўдзіцеля. Аналіз зместа арт. 13, р. III дае падставу сцвярджаць, што цяжар доказаў па справам аб абароне гонару і годнасці дзяржава ўскладала на таго, хто распаўсюджваў хлуслівыя весткі.

Найбольшую заканадаўчую абарону мелі суддзі. Узвышэнню іх аўтарытэту і папярэджванню з’яўлення безпадстаўных скаргаў з боку ўдзельнікаў працэса служыла норма арт. 1 р. VI. “О судьях”: "А естли бы судья добре судил и сказал водле тых прав писаных, а он ему приганил, тогды тот маеть ему заплатити за тую легкость дванадцать рублев грошей" [(6, с. 70]. Статут 1529 г. замацоўваў шэраг нормаў, накіраваных на папярэджванне актаў, зневажаючых гонар і годнасць асобы пад час судовага пасяджэння. Маральная шкода, якая выяўлялася праз абразу ўдзельнікаў працэсу дзеяннем ("калі бы хто на другого рукою сваею сягнул, пхнул, торгнул албо ударил перед судом...") падлягала безумоўнай кампенсацыі ў 20 рублёў грошай і пазбаўленню шляхецкай годнасці. (арт. 17, р. VI) [6, с. 78]. Разам з тым, закон прадугледжваў і адказнасць самаго суддзі за абразу ўдзельніка працэса словам або дзеяннем. Санкцыя нормы прадугледжвала турэмнае зняволеннне і выплату пакрыўджанаму кампенсацыі згодна яго саслоўю (арт. 18, р. VI).

Статут 1566 г. працягнуў традыцыю ўсебаковай абароны асобы. Шмат якія яго артыкулы паўтаралі нормы аб абароне жыцця, гонару, годнасці і здароўя асобы. Статут падрабязна вызначае памер галаўшчызны ў адносінах да шляхты, а таксама парадак яе выплаты. Рэгламентацыі галаўшчызны быў прысвечаны раздзел XI Статута 1566 года "О кгвалтехъ и головщызнахъ щляхецкихъ". Прадугледжвалася, што права на кампенсацыю маюць родныя браты, пры іх адсутнасці – родныя сёстры, а пры адсутнасці апошніх – іншыя блізкія родзічы.

Памер галаўшчызны і навязкі для простых людзей вызначаліся ў XII і XIII раздзелах і залежылі ад прафесійнай дзейнасці пацярпелага.

Вяршыняй сістэматызацыі права ВКЛ стала выданне Статута 1588 г. Ужо ў прадмове да яго "Всим вобец станам Великого Князтва Литовского", падрыхтаванай канцлерам Л. Сапегай выказвалася ідэя

каштоўнасці нематэрыяльных даброт асобы і неабходнасці іх абароны роўна з маёмаснымі правамі. Кожны прыстойны чалавек, на думку мысліцеля і палітыка, толькі праву павінен быць удзячны за тое што "... во отчызне своей беспечне мешкаючы не боитсе, абы его хто на добрай славе его змазати альбо на теле и на здоровъю его образити альбо тех на власной маетности его укрывдити мог" [4, с. 47]. Статут удакладняў санкцыі за злачынствы супраць жыцця і здароўя асобы. У р. XI указваліся памеры кампенсацыі маральнай шкоды пры нанясенні цялесных пашкоджанняў, або збіцці шляхціча (навязка), а таксама памеры кампенсацыі родзічам забітага шляхціча (галаўшчызна). Згодна з арт. 27 гэтага раздзела акрамя пакарання за забойства, прадугледжвалася галаўшчызна ў памеры 100 коп. грошай. Памер галаўшчызны і навязкі для простых людзей вызначаўся ў залежнасці ад прафесійнай дзейнасці пацяр-пелага.

Такім чынам, галаўшчызна як і раней залежыла ад саслоўнага паходжання, ад роду дзейнасці пацярпелага, а таксама ад месца здзяйснення злачынства і нават этнічнага паходжання пацярпелага, або крыўдзіцеля. Так, за панцырнага слугу, войта, бурмістра і іншых службовых асоб галаўшчызна складала 60 коп. грошай, за рамесніка – 30 коп. грошай, цяглага селяніна – 25 коп. грошай і г. д. (арт. 2, р. XII). За забойства жанчыны галаўшчызна спаганялася ў двайным памеры. Статут 1588 г. павялічыў і памер навязкі, які як і раней залежыў ад саслоўнай прыналежнасці пацярпелага, а таксама ад таго, якому органу цела была нанесена шкода. Так, за адсячэнне носа, вуха, губы – навязка шляхцічу складала 50 коп. грошай, а за страту мовы ў сувязі з ранай галавы – 100 коп. грошай. Як і галаўшчызна навязка павялічылася ў 2 разы (арт. 27, р. XI). У справах аб цялесных пашкоджаннях, аб забіцці простых людзей на-

вязка як і галаўшчызна выступала «фактычна таксіраваным коштам гэтага несвабоднага чалавека» [7, с. 186].

Дастаткова падрабязна Статут рэгламентуе адказнасць за абразу гонара і годнасці шляхціча і, у першую чаргу, тых прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя, якія займалі пасады ў дзяржаўным апараце або працавалі суддзямі. Справы аб крыўдзе шляхцічу ў прысутнасці гаспадара, або пры вялікакняскім двары разглядаліся самім вялікім князем. Закон прадугледжваў, што пададзены іск павінен быць разгледжаны не пазней як праз 3 дні (арт. 9, р.1). Вінаваты ў абразе шляхціча караўся адпаведнай кампенсацыяй. Тэрмін турэмнага зняволення і памер кампенсацыі залежыў ад таго, суправаджалася “ображенье” фізічнымі дзеяннямі, ці не. Справы, звязаныя з абаронай гонару і годнасці, разглядаліся неадкладна, што падкрэслівала іх асаблівае значэнне, месца і ролю шляхціча ў беларуска-літоўскім грамадстве. Статут 1588 г. рэгламентуе справы аб “ображенье” жанчыны – шляхцянкі. У тым выпадку, калі яе назвалі распутніцай, то крыўдзіцель падлягаў пакаранню і выплаце кампенсацыі ўдвая – 40 коп. грошай (арт. 28, р. III). Дадзеная норма з’яўляецца вельмі прагрэсіўнай для свайго часу таму, што яна замацоўвала права жанчыны на абарону свайго гонару. Тэндэнцыя да пашырэння правоў жанчын увогуле з’яўляецца характэрнай рысай Статута 1588 г.

Асаблівае значэнне Статут надае выпадкам нанясення абразы шляхцічу простым чалавекам. Абараняючы гонар шляхецкага стану, закон прадугледжвае жорсткае пакаранне вінаватаму "... вести до пренгира (ганебны слуп) и там его дубцы бити и потом высветчити (выгнаць з месца) (арт. 22, р. III) [4, с. 122]. Такім чынам, з простага чалавека закон не прадугледжваў кампенсацыю. Магчыма прыняцце грошай шляхцічам ад простага чалавека разглядалася з пункту гледжання грамадскай маралі таго часу, як прыніжэнне яго годнасці, таму такая норма і адсутнічала.

У Статуце 1588 г. зроблена спроба абароны права на асабістую і сямейную тайны. У арт. 59 р. IV замацавана норма, якая прадугледжвала адказнасць адваката (пракуратара), які выведаў факты па справе свайго падабароннага, і перадаў іх супрацьлегламу боку. Абаронца караўся пазбаўленнем права ўдзелу ў судовым працэсе. У выпадку нанясення шкоды таму, чые інтарэсы ён прадстаўляў, адвакат падлягаў турэмнаму зняволенню на 4 тыдні і штрафу на карысць пацярпеламу [4, с. 186].

Такім чынам, заканадаўства сярэдневяковай Беларусі дастаткова шырока рэгулюе асабістыя немаёмасныя правы і замацоўвае сродкі іх абароны. Безумоўна, гэта тычыцца ў першую чаргу правоў шляхты. Усе тры Статуты давалі магчымасць атрымаць матэрыяльную кампенсацыю за маральную шкоду пры "ображеньи" гонару і годнасці асобы, а таксама ў выпадку нанясення шкоды жыццю, здароўю і іншым немаёмасным правам чалавека. Памер і магчымасць атрымання кампенсацыі ставіліся ў залежнасць ад саслоўнага паходжання і сацыяльнага статуса пацярпелага. Кампенсацыя дакладна вызначалася Статутамі і яна не падлягала змяненню згодна з меркаваннем суддзі. Асобна рэгуляваліся выпадкі кампенсацыі маральнай шкоды жанчынам шляхецкага паходжання. Замах на яе жыццё, гонар, годнасць, здароўе вызначаўся больш высокай штрафной санкцыяй. Статуты прадугледжвалі разгляд іскаў аб парушэнні асабістых правоў шляхты (гонару і годнасці) ў першачарговым парадку. Выплата кампенсацыі не з’яўлялася падставай для адмены асноўнага пакарання за здзесненае злачынства, а выступала ў якасці дадатковай меры адказнасці. Усё гэта сведчыць аб высокай для свайго часу ступені распрацоўкі нормаў, якія абаранялі асабістыя немаёмасныя правы асобы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Фарміраванне дадзенага інстытута грамадзянскага права адбывалася пад уздзеяннем як мясцовых прававых традыцый, так і гуманістычных ідэй эпохі Рэнесанса.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Витушко, В.А. Курс гражданского права. Общая часть: В 5т. Т.2: научно-практ. пособие / В.А. Витушко. – Минск: БГЭУ, 2002. – 717 с.

2. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах ( Са старажытных часоў да нашых дзён) : Вучэбны дапаможнік / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск:Акадэмія МУС Рэсп. Беларусь, 1998. – 311 с.

3. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года / Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо; Редк. Т.І. Доўнар і інш. – Мінск: Тэсей, 2003. – 352 с.

4. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Рэдкал.: У. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.

5. Волян, Андрэй Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе / Андрэй Волян, – Мінск: Зміцер Колас, – 2009. – 142 с. – (Галерэя чалавечай думкі)

6. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года / под ред. К.И. Яблонскиса – Минск: изд-во Акад. наук БССР, 1960. – 253 с.

7. Доўнар,Т.І. Развіцце асноўных інстытутаўграмадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV- XVI стагоддзях. / Т.І. Доўнар – Мінск: “Прометей“, 2000. – 224 с.